М.М.Антоненка,
загадчык сектара БелНДІ эканомікі
і інфармацыі АПК,
кандыдат эканамічных навук

**Аграрная рэформа ў Беларусі - шлях у Еўрапескі саюз**

Геапалітычнае становішча краіны патрабуе такога стану эканомікі, які б дазваляў суб'ектам гаспадарання на роўных канкурыраваць на ўнутраным і знешнім рынках з вытворцамі з Заходняй Еўропы. Цяперашнія калгасы і саўгасы ў пераважнай большасці не ў стане вырабляць прадукцыю, якая б адпавядала па сваіх якасных і эканамічных параметрах умовам агульнаеўрапескага аграрнага рынку. Матэрыяльныя і працоўныя выдаткі на вытворчасць адзінкі асноўных відаў прадукцыі ў нашых вытворцаў значна вышэйшыя, чым у замежных. А па некаторых з іх яны значна вышэй чым сярэднееўрапейская рынкавая цана гэтай прадукцыі.

Кардынальнае павышенне канкурэнтаздольнасці прадукцыі немагчыма без правядзення радыкальных рэформаў. Яшчэ напачатку 50-х гадоў было ўстаноўлена, што адсутнасць матэрыяльнай зацікаўленасці ў непасрэдных вытворцаў не дазваляе калгасам і саўгасам эфектыўна гаспадарыць на зямлі. Развязаць ініцыятыву мог бы толькі пераход да рынкавай эканомікі, з прыватнай уласнасцю на сродкі вытворчасці, уключаючы зямлю. Але ідэалогія правячай партыі была непераадольнай перашкодай для правядзення рынкавых рэформ.

Пасля распаду СССР і абвяшчэння незалежнасці ўлады Беларусі працягвалі праводзіць ранейшую аграрную палітыку, але ўжо не выдаткоўваючы з бюджэту значных фінансавых уліванняў у эканоміку аграпрамысловага комплексу. Гэта непазбежна вяло да аграрнага крызісу.

У гэты час грамадства было ўцягнута ў бясплодныя дыскусіі аб шляхах развіцця сельскай гаспадаркі, формах уласнасці і гаспадарання. Спрэчкі гэтыя працягваюцца і да цяперашняга часу. Але ўлады яшчэ не вызначаліся ў аграрнай палітыцы і па інерцыі працягваюць ранейшую. Іх ідэалагічныя погляды і стэрэатыпы не стасуюцца з рынкавым мысленнем і таму нельга чакаць якіх-небудзь сур'езных перамен у аграрнай палітыцы ў бліжэйшы час.

Сусветнты вопыт сведчыць, што рынкавая эканоміка дае найбольшую прастору для развіцця прадукцыйных сіл. Гэта найбольш эфектыўны спосаб гаспадарання і ўсе краіны свету гэта прызнаюць. Беларусь у рэшце рэшт прыйдзе да яе, як бы хто гэтаму не перашкаджаў.

Спрэчным застаецца і пытанне аб накірунках аграрнай рэформы. Прыхільнікі камуністычнай ідэі, якія па-ранейшаму знаходзяцца ва ўладзе, сцвярджаюць, што толькі калгасна-саўгасная сістэма можа вывесці сельскую гаспадарку з крызісу і забяспечыць харчовую бяспеку краіны. Аднак рэчаіснасць абвяргае гэтыя высновы. На гэты конт дастаткова прывесці статыстычныя лічбы аб развіцці грамадскага і прыватнага сектараў эканомікі. Аказваецца, што крызіс закрануў толькі грамадскі сектар. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў ім склала ў 1996 г. толькі 55 % да ўзроўню 1990 г., г. зн. скарацілася амаль удвая. Менавіта за кошт яго адбылося агульнае падзенне сельскагаспадарчай вытворчасці за гэты перыяд на адну чвэрць. Прыватна-сялянскі жа сектар сельскай гаспадаркі за апошнія шэсць гадоў не толькі не паменьшыў вытворчасці, але і значна павялічыў яе ( на 39%), і па аб'ему зраўняўся з грамадскім.

Прыватны сектар засведчыў сваю жыццевасць у рынкавых умовах, а калгасна-саўгасны лег цяжкай ношай на бюджэт краіны. Сродкі, якія павінны выдаткоўвацца на сацыяльныя патрэбы грамадства (медыцынскае абслугоўванне, адукацыю, сацыяльнае забеспячэнне састарэлых і інвалідаў, будаўніцтва жылля і г.д.), у вялікіх памерах ідуць на падтрымку збанкрутаваных калгасаў і саўгасаў.

Не вытрымлівае крытыкі і сцвярджэнне аб немагчымасці прапанаваць што-небудзь лепшае замест калгасаў і саўгасаў. У постсацыялістычнай Еўропе ёсць прыклад паспяховага рэфармавання буйных дзяржаўных гаспадарак і кааператываў. Гэта аграрная рэформа ў былой ГДР. Немцы, аб'яднаўшыся ў адну краіну, павінны былі вельмі хутка правесці адаптацыю усходнегерманскай эканомікі да рынкавых умоў. Яны гэта зрабілі вельмі паспяхова.

Тэорыя развіцця аграрнай эканомікі таксама сведчыць аб магчымасці ў рынкавых умовах паспяхова развіваць як буйныя, так і сямейныя гаспадаркі. Напачатку стагоддзя аграрнікамі-эканамістамі Расіі была сфармулявана канцэпцыя аб двух магчымых шляхах рэфармавання, а затым і развіцця сельскай

гаспадаркі. Першы шлях, ен атрымаў назву «амерыканскага», прадугледжваў прыярытэтнасць у развіцці прыватных сямейных гаспадарак фермерскага (амерыканскага) тыпу. Дзеля гэтага трэба было разбурыць сельскую абшчыну і перадаць зямлю ў прыватную ўласнасць сялян, якія станавіліся ўласнікамі сямейных фермерскіх гаспадарак. Памешчыцкія гаспадаркі пры гэтым ліквідоўваліся.

Другі шлях атрымаў назву «прускі», таму што ў той час рэфармавалася сельская гаспадарка ў Прусіі. Ен прадугледжваў ліквідацыю дробных сялянскіх гаспадарак і абшчыннага землекарыстання. Аснову склалі буйнатэрытарыяльныя гаспадаркі рынкавага (капіталістычнага) тыпу. Пры гэтым сяляне трансфармаваліся ў наемных работнікаў, а памешчыкі - у прадпрымальнікаў.

Немцы не забыліся на магчымасць другога шляху развіцця і выкарысталі гэты гістарычны шанс. Сведчанне таму - паспяхова праведзеная аграрная рэформа ва ўсходніх землях Германіі па «прускаму» шляху. Гэты варыянт рэформы даказаў сваю эфектыўнасць. Створаныя рынкавыя гаспадаркі (акцыянерныя таварыствы, таварыствы з абмежаванай адказнасцю, кааператывы і інш.) па сваей эфектыўнасці нават пераўзыходзяць сямейныя фермерскія гаспадаркі.

Такі накірунак аграрнай рэформы стане, на нашу думку, і ў нас галоўным. Гэтаму спрыяюць як эканамічныя, так і сацыяльна-псіхалагічныя фактары і ўмовы.

Матэрыяльна-тэхнічная база ў нас сфарміравана для буйнай вытворчасці, людзі маюць прафесійныя навыкі на буйных прадпрыемствах, грамадская свядомасць пераканана ў перавагах буйнай вытворчасці перад дробнай, вопыт стварэння фермерскіх гаспадарак мае не зусім станоўчыя вынікі і г. д.

Што да гаспадарча-прававой формы суб'ектаў гаспадарання, то найбольш эфектыўнай сярод іх з'яўляецца акцыянернае таварыства. Гэта форма мае шэраг пераваг перад вытворчымі кааператывамі і таварыствамі з абмежаванай адказнасцю.

Акцыянернае таварыства - гэта найболей устойлівая форма аб'яднання капіталаў. Выбыцце з таварыства любога з удзельнікаў не вядзе да яго закрыцця. Кожны ўдзельнік мае магчымасць у любы момант прадаць свае акцыі без згоды другіх акцыянераў.

Распаўсюджванне акцый шляхам адкрытай падпіскі дазваляе аб'яднаць неабмежаваную колькасць фінансавых рэсурсаў і

накіраваць іх на ажыццяўленне сучасных тэхналагічных праектаў. Па сутнасці гэта бясплатны і беззваротны заем, які значна выгаднейшы за банкаўскі крэдыт.

У акцыянерных таварыствах захоўваецца рэальны капітал, таму што акцыі маюць незваротнасць. Гэтым самым забяспечваецца жыццяздольнасць акцыянернага таварыства.

Акцыянерныя таварыствы маюць унутраны механізм матывацыі да накаплення, развіцця і ўдасканалення структуры вытворчасці. У іх працоўныя адносіны заснаваны на працоўным дагаворы, што дазваляе без значных перашкод уводзіць у вытворчасць новыя тэхналогіі з меншай колькасцю працуючых.

Усе гэтыя фактары ў сукупнасці ствараюць прыярытэтнасць акцыянерных таварыстваў перад іншымі формамі гаспадарання на сучасным этапе развіцця сельскай гаспадаркі.

Ажыццявіўшы паспяховую аграрную рэформу, мы тым самым створым перадумовы для ўступлення ў Еўрапейскі Саюз. Членства ў ЕС дасць магчымасць атрымаць значную фінансавую дапамогу ад агульнаеўрапейскага бюджэту для развіцця і перааснашчэння на сучасныя тэхналогіі народнай гаспадаркі.

Па аб'ему гэтыя фінансавыя рэсурсы будуць нават большымі, чым у свой час Беларусь атрымоўвала з бюджэту былога СССР. Эфектыўна іх скарыстаўшы, краіна здолее пераадолець шматвяковую адсталасць і дасягнуць узроўню дабрабыта развітых краін Еропы. Грамадства ўступіць у больш высокую стадыю свайго развіцця.